**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за май 2016 г.

## Мерапрыемствы да Дня Перамогі, Дня Дзяржаўнага сцяга РБ

**8 мая**

На выступленне літаратурна-паэтычнай группы “Крынічка” сабраліся гледачы living рознага ўзросту. У праграме літаратурна-музычнай кампазіцыі “Долго будут пахнуть порохом слова” гучалі вершы беларускіх і рускіх аўтараў ваеннай тэматыкі. У выкананні Е. Шамарей прагучала песня “В землянке”. Для прысутных падрыхтавана выстава ваенна-патрыятычнай літаратуры “Подвиг великий и вечный”.

Плянтаўская СБ, 19 чал.

**11 мая**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры прайшоў урок Айчыны “Сімвалы малой Радзімы”, прысвечаны геральдычным сімвалам Кобрынскага раёна. Удзельнікамі ўрока сталі навучэнцы ліцэя сферы абслугоўвання г. Кобрына, якія з’явіліся не толькі ўважлівымі слухачамі, але і актыўнымі ўдзельнікамі падрыхтаванай супрацоўнікамі бібліятэкі мультымедыйнай віктарыны. Усе прысутныя атрымалі ў падарунак калярова аформленыя тэксты дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь.

ЦБ, 44 чал.

## Мерапрыемствы ў рамках рэспубліканскай акцыі “Сямейнае чытанне”

**13 мая**

Тэматычны вечар “Галоўная каштоўнасць у жыцці”. На свяце ўшаноўваліся сем’і-юбіляры, якія з'яўляюцца актыўнымі чытачамі бібліятэкі. Для іх гучалі цёплыя словы віншаванняў са святам. Парадавала прысутных канцэртная праграма, падрыхтаваная супрацоўнікамі Дома культуры. Прыгожа дапоўніла мерапрыемства і прэзентацыя “Сямья – гэта шчасце”.

Батчынская СБ, 95 чал.

**15 мая**

Дзень сямейнага адпачынку “Усёй сям’ёй у бібліятэку” сабраў за салодкім сталом дзяцей і іх бацькоў. На мерапрыемстве матулі расказвалі аб сваіх сямейных традыцыях, выхаванні дзяцей, прыцягненню іх да чытання, аб прачытаных кнігах і любімых кніжных героях, сямейных захапленнях. Усе разам актыўна ўдзельнічалі ў конкурсе “Я ведаю прыказку пра сямью”, у віктарыне “Усе кнігі пра сям’ю”. Для прысутных падрыхтавана кніжная выстава “Усё пачынаецца з сям’і”.

Лелікаўская СБ, 22 чал.

**16 мая**

Сумесна з працаўнікамі Дома культуры праведзены Дзень чытаючай сям'і «Хай кнігі сябрамі заходзяць у вашу хату». Дзеці і іх бацькі пазналі, якія

традыцыі трэба захоўваць у сям'і, паказалі сваю эрудыцыю ў віктарынах «7 “Я”», «Домашний очаг» і «Жартоўная». Удзельнікі мерапрыемства з задавальненнем чыталі вершы, адгадвалі загадкі, дапаўнялі прыказкі і прымаўкі пра сям'ю, успаміналі любімыя кнігі разам з Мэры Попінс. Дадаткам да мерапрыемства сталі музычныя застаўкі з песнямі пра сям'ю, кніжная выстава «Хай кніга ўваходзіць у кожную хату» і сяброўскае чаяванне.

Арэхаўская СБ, 20 чал.

**18 мая**

Сумесна з працаўнікамі Дома культуры праведзены тэматычны вечар «Семья, как много в этом слове». У цёплай, сямейнай атмасферы мерапрыемства дзеці і іх бацькі чыталі вершы, бралі ўдзел у разнастайных конкурсах і віктарынах, слухалі песні ў выкананні А. П. Кірыеўскага. У рамках праграмы праведзена прэзентацыя зборніка вершаў мясцовай паэткі Н. Кандрашук. Увазе наведвальнікаў прапанавана кніжная выстава «Семейному чтению – наше почтение».

Магдалінская СБ, 30 чал.

**18 мая**

Літаратурна-музычная гасціная “Мой дом – мой свет”. Супрацоўнікамі бібліятэкі арганізавана выстава “Семья – творения венец”. Удзельнікі ЛПГ «Натхненне» пазнаёмілі гледачоў з гісторыяй свята, расказалі пра традыцыйныя сямейныя каштоўнасці. Госці мерапрыемства прынялі актыўны ўдзел у гульнях, віктарынах і конкурсах на лепшае выкананне верша, песні, прыпеўкі пра сям'ю: «Я самая чароўная і прывабная», «Вуснамі немаўляці», «На «мужчынскай мове…». Дзеці разам з бацькамі ўспаміналі сямейныя запаведзі, народныя прыказкі, прымаўкі і разгадвалі загадкі. Завяршылася сустрэча мастацкай майстэрняй «Калі сям'я разам». Ніводны з маленькіх удзельнікаў не застаўся без салодкага прыза.

Гарадзецкая СБ, 50 чал.

## <u>Іншыя мерапрыемствы</u>

**6 мая**

Тыдзень традыцыйнай культуры адкрыўся чарговым пасяджэннем клуба сямейнага чытання "Звініць вялікодная радасць". Удзельнікі клуба (сям'я Брыштэль) прадставілі свае сямейныя традыцыі святкавання Пасхі, падзяліліся святочнымі рэцэптамі і спосабамі афарбоўкі яек. Гапановіч А. Н. паведаміў аб уласных правераных спосабах барацьбы з узростам і прадэманстраваў комплекс практыкаванняў для вачэй. Момлік Н. І. прачытала свае новыя вершы і распавяла аб абрадзе катання яек. Дом рамёстваў прадставіў вялікодную выставу. Пушыла Наталля выступіла з музычным віншаваннем.

Дзівінская СБ, 28 чал.

**13 мая**

Аддзел бібліятэчнага маркетынгу працягвае вучобу кадраў у рамках Года культуры. Насычана і інфарматыўна прайшоў семінар «Імідж і этыка ў прафесійнай дзейнасці бібліятэкараў». У сваіх выступленнях метадысты аддзела маркетынгу і супрацоўнікі публічных бібліятэк грунтоўна раскрылі тэматыку семінара і падзяліліся ўласнымі прафесійнымі напрацоўкамі.

ЦРБ, 62 чал.

**15 мая**

На гадзіне ведаў “В рабстве вредных привычек” (да Сусветнага дня без тытуню) ў рамках пасяджэння клуба “Пунцовая кветачка” сабраліся старшакласнікі. Бібліятэкар расказала, якія звычкі лічацца карыснымі, а якія перашкаджаюць здароўю. Дзеці адгадвалі загадкі пра прадметы, якія дапамагаюць весці здаровы лад жыцця, выбіралі карысныя і шкодныя звычкі, адказвалі на пытанні віктарыны. У канце мерапрыемства прайшло тэсціраванне “Ці лёгка вам адмовіцца ад шкоднай звычкі?”.

Буховіцкая СБ, 16 чал.

**19 мая**

У свяце кнігі "Поиграем в сказку" прынялі ўдзел першакласнікі СШ №2. Дзеці актыўна ўдзельнічалі ў спектаклях па матывах казак "Рукавичка" (руская народная казка), "Сказка о глупом мышонке" (С. Маршак), адказвалі на пытанні віктарыны "Давайте любимые сказки вспомним". Скончылася свята дзіцячай дыскатэкай.

ДБ, 45 чал.

**23 мая**

Для вучняў малодшых класаў прайшла гадзіна вясёлых забаў “З кнігай з дзяцінства я сябрую”. У рамках знаёмства з бібліятэкай маленькіх наведвальнікаў асабліва зацікавіў выставачны стэлаж з навінкамі дзіцячай літаратуры “Ўсё ў свеце цікава”. У гульнёвай і займальнай форме прайшоў урок правіл карыстання кнігай, асцярожнага звароту з ёй. Віктарыны “Загадкі і адгадкі”, “Загадкі-падманкі” паднялі дзецям настрой і прымусілі іх выявіць кемлівасць і ўважлівасць.

Павіццеўская СБ, 18 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81